сены на панскія, дворныя абшары, якія ў Віленшчыне занімаюць больш за 1½ мільёна дзесяцін.

## Адозва Таварыства Беларускае Школы

ГРАМАДЗЯНЕ БЕЛАРУСЫ!

Палажэньне асьветы сярод Беларускага народу незвычайна цяжкое. Некалькі мільёнаў беларусаў маюць адну толькі сярэднюю школу і некалькі сот пачаткавых школ. І гэтыя школы маюць больш ворагаў, як прыхільнікаў. Маладое пакаленьне гадуецца безь ніякае адукацыі. Людзі з кожным годам балей і балей дзічэюць.

Каб абараніць свой народ ад духоўнай і эканамічнай галіты і няволі і вывесьці яго да сьветлага лепшага жыцьця, трэба ўсім беларусам прыкласьці сваю руку да беларускай школьнай справы.

Маючы гэта на ўвазе, закладзена зацьверджанае ўжо дэпартамэнтам унутраных спраў „Т–ва Беларускай Школы“[1].

Мэта таварыства: пашыраць асьвету ў беларускім нацыянальным духу.

Т–ва, паміж іншым, мае права: 1) закладаць, утрымліваць і пашыраць народныя школы, вучыцельскія курсы, сэмінарыі, вышэйшыя і сярэднія школы і інш.; 2) закладаць народныя дамы; 3) выдаваць і пашыраць школьныя кнігі і газэты; 4) даваць вучанікам стыпэндыі, падмогі і розную навуковую помач.

Паводле статуту, могуць усюды закладацца гурткі і аддзелы Т–ва.

„Т–ва Беларускай Школы“ стаіць у старане ад усіх палітычных партыяў і кірункаў, адзінаю яго задачаю ёсьць разьвіцьцё беларускіх школ і беларускай асьветы наагул.

Кожны беларус і беларуска павінны запісацца ў Т–ва і наказаць сваім знаёмым, каб запісаліся.

Як запішацца даволі, тады будзе скліканы агульны сход, які выбераць Раду Т–ва і пачне канкрэтную працу.

Запісавацца просім у канцылярыі беларускіх вучыцельскіх курсаў (Вастрабрамская, 9) штодня ад 10—2 гадзіны ў дзелавода Лістапада.

Ад імя закладчыкаў

*Ант. Луцкевіч.*
*М. Кахановіч.*